*Ядвіга Суботка*

**НАРОДНЫ ТАНЕЦ У АМАТАРСКАЙ ТВОРЧАСЦІ**
***(ансамбль танца «Верасок» і фальклорны гурток «Крыніца» Капаткевіцкага гДК Петрыкаўскага р-на. Гомельскай вобл.)***

У 1988 годзе ўпершыню я пачала вывучаць гарадскія побытавыя танцы, а дапамагалі мне ў гэтым бабулі тых дзяцей, што займаліся ў ансамблі танца «Верасок», якім я кірую. Шчыра дзякую Надзеі Пятроўне Ракіцкай, Праскоўі Сямёнаўне Лазарчык за тое, што навучылі. Хачу сказаць, што дзеці не адразу ахвотна сталі танцаваць побытавыя танцы, але з цікавасцю назіралі, як гэта робяць іх бабулі, а потым і самі ўжо далучыліся да іх. Першы танец, якому навучыліся дзеці, быў «Падэспань». Здавалася, лёгка і проста, але ж трэба было зразумець тое, што танцуеш, данесці характар і манеру выканання танца.

Пазней пачалі вучыць танцы больш складаныя: «Лявоніха», «Ва саду лі…», «Кракавяк», «Карапэт», «Месяц», «Субота». Гэтыя танцы былі ўключаны ў рэпертуар ансамбля танца «Верасок» пад агульнай назвай «Вянок беларускіх танцаў».

Калі ўпершыню гледачы ўбачылі праграму «Вянок беларускіх танцаў», то былі прыемна ўражаны. І гэта зразумела, бо шмат людзей не ведаюць колішніх мясцовых побытавых танцаў. Таму з цягам часу мы разам з удзельнікамі ансамбля вырашылі, што трэба вывучаць і адраджаць лакальную танцавальную культуру свайго рэгіёна. Гэтаму папярэднічала работа з яе носьбітамі.

Так са слоў Сарокінай Ефрасінні Пятроўны, 1926 года нараджэння, жыхаркі г.п. Капаткевічы, быў запісаны танец-гульня «Полька». Перш чым падрыхтаваць гэты танец, было шмат працы. У гэтым танцы асноўны танцавальны крок – дробная полька. Трэба было дроненька прыстукваць і кружыцца ў пары, роўна, не падскокваючы. Не адразу ўсё атрымоўвалася, але дзеці старанна вучыліся.

Змест гэтага танца-гульні такі: гуляюць парамі, але, калі мала хлопцаў ці дзяўчат, то гульня была яшчэ больш цікавай. Таму што дзяўчаты маглі танцаваць з тымі хлопцамі, хто ім падабаўся, ці наадварот, хлопцы лавілі тых дзяўчат, якія ім падабаліся. Потым усе станавіліся парамі па колу. Выбіраўся вядучы – хлопец або дзяўчына, якім не хапіла пары. Вядучы станавіўся ў сярэдзіну кола. У руках ён трымаў дзяркач. Гучала музыка (гэта была полька), усе парамі танцавалі па колу, і вядучы таксама танцаваў з дзеркачом у цэнтры кола. Высока ён трымаў дзяркач. Як толькі вядучы выбраў сабе партнёра, ён стукаў дзеркачом па падлозе. Музыка спынялася, а вядучы, не выпускаючы дзяркач з рук, хапаў сабе ў пару. Адначасова ўсе ўдзельнікі шукалі сабе новых партнёраў. Пары мяняліся, прабягаючы толькі па колу, а вядучы мог бегаць толькі праз сярэдзіну кола. Як толькі пары памяняліся, вядучы таксама знаходзіў сабе пару і перадаваў дзяркач таму ўдзельніку, які застаўся без яе. Бывала так, што хлопец станавіўся з хлопцам у пару, і тады гэта вызывала смех і ў танцораў, і ў тых, хто глядзеў гульню. Гульня працягвалася, новы вядучы стукаў аб падлогу дзеркачом. Гэта было знакам музыкам пачынаць іграць. Бывала так, што вядучы не знаходзіў сабе пару па той прычыне, што спазняўся, таму зноў станавіўся вядучым.

Вядучы павінен быў не проста стаяць, а танцаваць і паказваць сваё майстэрства. Яшчэ вядучы гаварыў музыкам словы: «Музыкі, грайце! Танчым усе!» Калі ўсе стамляліся, то апошні вядучы стукаў па падлозе дзеркачом і казаў: «Хопіць, пара ўжо дамоў!» Звычайна танцавалі гэты танец-гульню ў канцы вечарыны. Кожны знаходзіў сабе пару. Так гуляла моладзь у тыя даўнія часы. Падабаецца гэты танец-гульня і зараз як яе ўдзельнікам, так і гледачам.

Цікавы танец быў запісаны са слоў Бутлавай Валянціны Рыгораўны, 1949 года нараджэння. Танец яна пераняла ад сваёй маці, якая жыла ў вёсцы Бесяды Петрыкаўскага раёна. Танцавалі па колу. Асноўны крок – дробная полька. Хто-небудзь з музыкантаў аб'яўляў, што за чым танцаваць. Першае калена – агульнае кола парамі, другое – агульнае кола па аднаму, трымаючыся за рукі. Трэцяе калена – «Мост масціць». Усе «запляталіся ў вароты» і станавіліся ў калону. Чацвёртае – «Расплятайся». Усе зноў выходзілі з шарэнгі на кола. Пятае – «Полька ў пары». Усе кружыліся па парах па колу. Шостае – «Кола па аднаму». Сёмае – «Два колы». А потым усё пачыналася спачатку. Польку дробную танцавалі па колу па парах, а ўсе іншыя калены асноўным крокам: прытуп правай нагой, як бы кульгаючы на правую нагу. Калі ўсе разам рабілі прытуп, гэта было прыгожа і рытмічна. Заўсёды ў гледачоў выклікаюць цікавасць фігуры «Мост масціць»
і «Расплятайся». «Полька-мост» выконваецца дынамічна, таму на канцэрце гэты нумар заўсёды цікавы для гледачоў.

На рэпетыцыях з малодшай групай (6-8 гадоў) ансамбля танца «Верасок» я абавязкова выконваю танцы нашага рэгіёна. У рэпертуары ансамбля «Верасок» танцы «Падэспань», «Кракавяк», «Нарэчанька», «Свеціць месяц», «Каробачка», «Субота», «Каханачка», «Ойра», «Сербіянка», «Полька ў пяць кален», «Полька-шчабятуха», «Ва саду лі…», «Карапэт», «Барыня», «Кадрыля», «Полька-мост», танец-гульня «Дзяркач», «Мікіта». На вечарынах, дзе танцуюць моладзь і людзі сталага ўзросту, яны заўсёды выклікаюць цікавасць у іншых людзей, якія потым прыходзяць да нас у дом культуры, каб навучыцца танцаваць. Так у 1989 годзе пры Доме культуры быў створаны фальклорны гурток «Крыніца» з мэтай вызваць цікавасць у дзяцей да каляндарна-земляробчых і сямейна-бытавых свят і абрадаў, музычнага, танцавальнага, песеннага і вусна-паэтычнага фальклору. Таму і методыка правядзення заняткаў самая разнастайная. Гэта самастойныя і калектыўныя міні-даследаванні суцэльным і выбарачным метадамі, калі вывучаецца і апісваецца цэлая

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

сістэма фальклорных традыцый або адна з іх. Гэтаму папярэднічаюць сустрэчы з носьбітамі фальклору, вывучаецца геаграфія бытавання фальклорных адзінак, вядуцца апісанні народных святаў, робяцца запісы побытавых танцаў, песень, легенд, паданняў, прыказак, дзіцячых лічылак, гульняў. Удзельнікі гурта «Крыніца» з задавальненнем прымаюць удзел у народных святах і абрадах: «Каляды», «Масленіца», «Гуканне вясны», «Тройца», «Купалле».

Нельга не адзначыць і такі выхаваўчы момант у рабоце з малодшым пакаленнем, як удзел у вечарынах-канцэртах не толькі дзяцей, але і іх бацькоў, сваякоў, якія з'яўляюцца лепшымі мясцовымі музыкамі і спевакамі. Такая пераемнасць пакаленняў вучыць разумнаму жыццю ў соцыуме, а інсцэніроўкі, спевы, гульні, карагоды і танцы робяць заняткі ў гуртку займальнымі і цікавымі.

Удзельнікамі фальклорнага гурта «Крыніца» былі запісаны цікавыя танцавальныя гульні-карагоды. Напрыклад, калі праходзіць у Капаткевічах «Тройца», ладзіцца гульня-карагод «Бярозка». Дзяўчаты становяцца ў карагод, узяўшыся за рукі, на плечы накідваюць хусцінкі. Выбіраецца самая прыгожая дзяўчынка-«бярозка», якая становіцца ў цэнтр кола. Іншыя дзяўчаты ходзяць па колу і спяваюць: «Бярозка белая, макаўка зялёная, /Летам махнаценькая, /Зімой качкаваценькая /Дзе яна стаіць, там і шуміць».

Дзяўчаты спяваюць, а «бярозка» ідзе ў сярэдзіне кола ў супрацьлеглым, чым карагод, напрамку. Дзяўчына збірае хусцінкі, падымае іх высока над галавой і імітуе рух галінак (махае галінкамі). Дзяўчаты ідуць па колу і зноў пяюць: «Бярозка зялёненькая /Вясной вясёленькая /Сярод поля стаіць, /Лісточкамі шуміць, /Залатым званочкам звініць». Дзяўчына-«бярозка» робіць рухі рукамі, а карагод спявае наступны куплет: «А восенню карані /У бярозкі засыпаюць, /Лісточкі ападаюць». Адначасова «бярозка» абыходзіць карагод і кожнаму на плячо кладзе хусцінку. Пераможцай будзе тая дзяўчына, якая лепш за ўсіх імітуе рухі бярозкі. Вышэйназваная гульня-карагод была запісана са слоў Ваяводы Марыі Іванаўны, 1904 года нараджэння.

На «Каляды» праходзіць цікавая гульня «Ката пячы». Гаспадыня пасля частавання, вясёлых песень і танцаў запрашае на гульню. Нацягваецца вяроўка вышэй галавы чалавека. Чапляюць на вяроўку выпечанага «ката», які трымае каўбасу. Той, хто гуляе, павінен асядлаць качаргу і са словамі: «Еду з кута па ката, цап за ката», падскоквае ўверх, каб дастаць каўбасу зубамі. Калі не зможа дастаць, то госці малявалі яму сажай вусы, як у ката. А калі пашанцавала дастаць каўбасу, то ігрок забіраў яе як узнагароду за гульню. Асабліва вызывае ў гледачоў смех тое, як няўдала ўдзельнікі гульні падскокваюць на качарзе і ловяць каўбасу зубамі. Гэта гульня была запісана ад Валянціны Фёдараўны Нікіценкі, 1939 года нараджэння.

Правадзімая работа ў гуртках дазваляе далучыцца дзецям да народных святаў і абрадаў, уключыцца ў фальклорныя традыцыі сваёй малой Радзімы, ведаць жанравыя асаблівасці абрадавых і пазаабрадавых песень, танцаў, гульняў. Усё гэта дало магчымасць удзельнікам асамбля танца «Верасок» і фальклорнаму гуртку «Крыніца» паказваць свае здольнасці ў час удзелу ў абласных конкурсах побытавага танца ў гарадах Калінкавічы і Мазыры, а таксама ў фестывалі фальклорнага мастацтва «Берагіня». Лепшыя выканаўцы былі ўзнагароджаны дыпломамі I-V ступені і каштоўнымі падарункамі. Ёсць такая прымаўка: «Рабіць работу навучаць, а танцаваць трэба вучыцца». Спяваць, танцаваць ці іграць на музычным інструменце, дарыць радасць людзям, нічога ўзамен не патрабуючы, можа не кожны. Тое, чаму навучыліся нашы дзеці, яны ніколі не забудуць і будуць перадаваць гэтае духоўнае багацце сваім дзецям. І так з пакалення ў пакаленне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ